■ Суседзі

# ПРЫ ПОЎНЫХ ЗАЛАХ

## У Літве паспяхова прайшоў фестываль беларускага кіно

**Ён праходзіў у чатырох гарадах — Вільнюсе, Клайпедзе, Шальчынінкаі і Візагінасе. Арганізатарамі фестывалю выступілі Міністэрства культуры Беларусі, Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» і Пасольства Беларусі ў Літве.**

Поўныя залы гледачоў збірала камедыя «Белыя росы», якая ўжо стала легендарнай, у пастаноўцы рэжысёра Ігара Дабралюбава. З больш новых карцін з вялікай цікавасцю ўспрынялі фільм рэжысёра Аляксандра Бутара «Салодкае развітанне Веры», у якім разам з Паўлам Харланчуком-Южаковым, Сяргеем Жураўлём, Ганнай Палупанавай, Таццянай Баўкалавай, Аленай Сідаравай, Аленай Гіранок сыгралі і літоўскія акцёры Нэле Савічэнка-Клімене і Юозас Будрайціс.

Для юных гледачоў быў прыгатаваны прыгодніцкі фільм Алены Туравай «Кіндэрвілейскі прывід». Усе фільмы — вытворчасці Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм».

Актывізацыі беларуска-літоўскіх культурных адносін, несумненна, спрыяў Дагавор аб супрацоўніцтве, які сёлета ў Вільнюсе падпісалі міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў і міністр культуры Літвы Шарунас Біруціс. У Дагаворы прадугледжана шырокая праграма супрацоўніцтва ў сферы культуры на 2016—2018 гады.

«Мы рады пашырэнню і паглыбленню літоўска-беларускіх культурных адносін. Мы абавязаліся дапамагчы арганізаваць мерапрыемствы, якімі будзем адзначаць важныя для абедзвюх дзяржаў гістарычныя падзеі, юбілеі выдатных асоб, як, напрыклад, 500-годдзе друкарні Францішка Скарыны. Мерапрыемствы з гэтай нагоды ў 2017 годзе пройдуць у абедзвюх дзяржавах, — сказаў Шарунас Біруціс. — Мы дамовіліся садзейнічаць развіццю прамых кантактаў у сферы музыкі, тэатра, музеяў, бібліятэк, культурнай спадчыны. Шмат мерапрыемстваў намечаны і ў галіне кінематаграфіі. Акрамя штогадовага абмену Днямі кіно, нашым кінематографам будуць створаны ўмовы ўдзельнічаць у Мінску на міжнародных кінафестывалях «Лістапад» і «Анімаёўка», а беларускім калегам — прадстаўляць свае кіно ў Вільнюсе на міжнародным кінафестывалі «Вясна кіно».

Сёлета фестываль беларускага кіно праходзіў у рамках праграмы Дзён культуры Беларусі ў Літве, якія яшчэ будуць доўжыцца да канца лістапада.

**Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС, уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве**

■ Будзе свята!

# У КАЗКУ ДА ДЗЕДА МАРОЗА

## ЗАПРАШАЮЦЬ І ДАРОСЛЫХ, І ДЗЯЦЕЙ

**Навагодні цягнік з Мінска ў маёнтак Дзеда Мароза ў нацыянальным парку «Белавежская пушча» пачне курсіраваць з 16 снежня.**



Фота БЕЛТА.

У госці да Дзеда Мароза 16 і 23 снежня, а таксама 3, 5, 7 і 13 студзеня турыстаў даставіць спецыяльны святочны цягнік з купэйных вагонаў. Святочную атмасферу пасажыры адчуюць з першых хвілін — іх сустрэнуць дзяўчаты-праваднікі ў касцюмах Снягурак. Паездкі прапануюцца ў фармаце тураў выхаднога дня з выездам у пятніцу ўвечары, а рэйсы навагодняга экспрэса 3, 5 і 7 студзеня разлічаны на перыяд зімовых канікул у школьнікаў. Навагодні састаў будзе адпраўляцца ў маёнтак Дзеда Мароза са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 21.50 і прыбываць у Брэст раніцай наступнага дня ў 7.54, адкуль турыстаў даставяць у Белавежскую пушчу аўтобусамі. У нацпарку госці правядуць цэлы дзень. Падарожнікаў чакае насычаная навагодняя экскурсійная праграма: яны наведаюць маёнтак беларускага Дзеда Мароза, убачаць домік Снягуркі, музей падарункаў «Скарбніца», чарадзейны калодзеж і ветраны млын, змогуць загадаць жаданне на Паляне Казак і атрымаць навагодні падарунак ад самога Дзеда Мароза. У праграму тура таксама ўваходзіць знаёмства з музеем прыроды нацпарка, шпацыр уздоўж вальераў з жывёламі і пачастунак блінамі з гарбатай на пушчанскіх травах. Назад у сталіцу з Брэста навагодні цягнік адправіцца ў 18.12 і прыбудзе ў Мінск у 22.47, у дарозе пасажыраў чакаюць конкурсы ад аніматараў.

Беларуская чыгунка падрыхтавала праграму і для гасцей з суседняй краіны, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі. Навагодні экспрэс з Беларусь з Масквы адправіцца 3 студзеня ў 19.35. Расійскім турыстам прапануюць насычаную праграму з экскурсіямі па Мінску, выездамі ў Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж», замкавы комплекс «Мір», музейны комплекс народных рамёстваў «Дудуткі». Увечары 5 студзеня турысты адправяцца з Мінска на навагоднім цягніку ў Брэст, дзе акрамя экскурсіі ў маёнтак беларускага Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы іх чакае наведванне Брэсцкай крэпасці. Гэта пяцідзённае падарожжа разлічана на зборныя групы турыстаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.37 | 17.10 | 8.33 |
| Віцебск — | 8.32 | 16.54 | 8.22 |
| Магілёў — | 8.27 | 17.00 | 8.33 |
| Гомель — | 8.18 | 17.03 | 8.45 |
| Гродна — | 8.52 | 17.27 | 8.35 |
| Брэст — | 8.46 | 17.33 | 8.47 |

## Месяц

*Поўня 14.11—20.11.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

## Імяніны

*Пр. Канстанціна.*
*К. Амеліі, Марыі, Альберта, Артура, Леапольда.*



Фота Івана КУПАРВАСА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Ганна, я хачу нарэшце пажыць трохі і для сябе!

— Мікола, хто супраць?! Жыві... пакуль я фарбуюся.

**На самай справе, мужчыны прызнаюць наяўнасць жаночай інтуіцыі.**

**...Але называюць яе па-свойму: «Сурочыла!»**

Думкі дамашняга ката:

«Гаспадыня хахаля прывяла. Усю ноч з ёй спаў. На маім месцы. Зараз на кухні зачыніліся, мяне не пускаюць. З маёй міскі, напэўна, жарэ...»



Малюнак Алега ГУЦОЛА.

Даты | Падзеі | Людзі

## 15 ЛІСТАПАДА

**1866** год — нарадзілася Аляксандра Яблачкіна, руская тэатральная актрыса, народная артыстка СССР. Высокі густ, выключная ўвага да чысціні мовы, строгая этычная патрабавальнасць да сябе і накаваольных вызначалі Яблачкіну як мастака і чалавека. Цудоўная выканаўца роляў класічнага рэпертуару, яна шмат выступала і ў п'есах сучасных рускіх і заходнееўрапейскіх драматургаў.

**1921** год — 95 гадоў таму нарадзіўся (в. Старыя Грамыкі Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці) Рыгор Пятровіч Грамыка, беларускі графік. У 1940 годзе скончыў Віцебскае мастацкае вучылішча. З 1954-га ўдзельнічаў у мастацкіх выставах. З 1972 года — мастацкі рэдактар часопіса «Вожык». Аўтар карыкатур на бытавыя, палітычныя тэмы. Памёр у 1987 годзе.

**1934** год — у СССР адбылася першая гукавая тэлеперадача. Перадача была вывы на адлегласць была даўняй марай чалавецтва. Два дасягненні — кіно («вялікі нямы») і радыё («вялікая невідзімка») — павінны былі злучыцца, каб узнікла тэлебачанне. Доўжылася перадача 25 хвілін і ўяўляла сабой эстрадны канцэрт. Знакаміты артыст І.М. Масквін прачытаў апавяданне А.П. Чэхава «Зламыснік», затым выступілі спявачка і балетная пара.



**1951** год — нарадзіўся (г. Мінск) Віктар Скарабагатаў, спявак, педагог, музычны дзеяч, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь. З 1977 года — саліст Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, з 1992-га — мастацкі кіраўнік створанай ім «Беларускай капэлы». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1953** год — нарадзіўся (г. Горкі Магілёўскай вобласці) Цыганоў Аляксандр Рымавіч, беларускі вучоны ў галіне хіміі, акадэмік НАН Беларусі, член-карэспандэнт Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь (1999—2002), доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар. Аўтар больш чым 800 навуковых прац. З 2008 года — намеснік Старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук, з 2012-га — прарэктар па вучэбнай рабоце і міжнародным супрацоўніцтве Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

Было сказана

**Уладзімір ЛІПСКІ, пісьменнік, публіцыст:**
*«Акрылёная душа святкуе штодня!»*

ОАО «Рыбхоз «Красная Зорька» в связи с ликвидацией
ПРОИЗВОДИТ ПРОДАЖУ ТОВАРНОЙ РЫБЫ:
• КАРП, ТОЛСТОЛОБИК;
• РЫБОПОСАДОЧНЫЙ МАТЕРИАЛ: КАРП.
По вопросам приобретения обращаться по тел. 8 029 645 45 14, Лукашев Д.Л.
УНП 400044343



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4530.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 14 лістапада 2016 года.